## Семінар 6.
## Этапы развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь

**Распад СССР і яго прычыны.** Распад Савецкага Саюза як адзінай федэратыўнай дзяржавы адбываўся досыць імкліва. У 1989–1991 гг. адбываўся г.зв. «парад суверэнітэтаў», калі асобныя саюзныя рэспублікі, а часам нават і аўтаноміі ў складзе гэтых рэспублік прымалі дэкларацыі аб суверэнітэце. Пры гэтым рэспубліканскі суверэнітэт разумеўся як складовая частка агульнасаюзнага. Але гэта непазбежна прывяло да супярэчнасцей у юрысдыкцыі. Вярхоўны Савет БССР прыняў такую Дэкларацыю 27 ліпеня 1990 г.

Моцныя нацыянальна-дэмакратычныя рухі сфарміраваліся ў Прыбалтыцы і Закаўказ'і. У шэрагу выпадкаў на іх бок пераходзіла і мясцовае партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва. 11 сакавіка 1990 г. Літва абвясціла аб аднаўленні сваёй незалежнасці. Літаральна праз месяц (9 красавіка) Грузія таксама заявіла пра выхад з Савецкага Саюза. 4 мая 1990 г. Дэкларацыю аб аднаўленні дзяржаўнасці прыняла Латвія. 20 жніўня 1991 г. Вярхоўны Савет Эстоніі канчаткова зацвердзіў незалежны дзяржаўны статус сваёй краіны. Разам з тым Малдова і Арменія адмовіліся ўдзельнічаць у перамовах па стварэнні абноўленага Саюза Сувярэнных Дзяржаў.

Імкнучыся захаваць агульную фэдэратыўную дзяржаву на новых дэмакратычных асновах, саюзнае кіраўніцтва ініцыявала правядзенне рэферэндума. На агульнанароднае галасаванне выносілася пытанне «Ці лічыце Вы неабходным захаванне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік як абноўленай федэрацыі роўнапраўных суверэнных рэспублік, у якой будуць у поўнай ступені гарантавацца правы і свабоды чалавека любой нацыянальнасці?». Крызіс саюзнай дзяржаўнасці падкрэсліваўся тым фактам, што органы ўлады Грузіі, Літвы, Малдовы, Латвіі, Арменіі і Эстоніі адмовіліся праводзіць галасаванне. Тым не менш, у рэферэндуме прынялі ўдзел 80,03% выбаршчыкаў. Станоўча на пытанне адказалі 76% з іх. У БССР на ўчасткі для галасавання прыйшлі 83,3% грамадзян, якія мелі права голасу. 82,7% з іх падтрымалі захаванне Саюза.

Тым не менш, працэс распаду працягваўся. 1 снежня 1991 г. ва Украіне, якая была другой пасля Расійскай Федэрацыі саюзнай рэспублікай па памерах тэрыторыі, насельніцтву і эканамічнаму патэнцыялу, адбыўся рэферэндум па зацвярджэнню «Акта абвяшчэння незалежнасці Украіны». У ім прынялі ўдзел 84,18% выбаршчыкаў, з якіх 90,32% падтрымалі гэта рашэнне. Рэфереэндум стаў каталізатарам цэнтрабежных тэндэнцый. Ужо 8 снежня 1991 г. ва ўрадавай рэзідэнцыі Віскулі, што знаходзіцца на тэрыторыі Белавежскай пушчы ў Беларусі, сабраліся дэлегацыі трох саюзных рэспублік: Расіі на чале з прэзідэнтам Барысам Ельцыным, Украіны, якую ўзначальваў прэзідэнт Леанід Кучма, і Беларусі пад кіраўніцтвам старшыні Вярхоўнага Савета Станіслава Шушкевіча. У выніку перамоў было падпісана «Пагадненне пра стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў», вядомае таксама як «Белавежскае пагадненне». У яго прэамбуле ўдзельнікі сустрэчы запісалі: «Саюз ССР як суб'ект міжнароднага права і геапалітычная рэальнасць спыніў

сваё існаванне». Такім чынам быў дэнансаваны Дагавор 1922 г. пра стварэнне СССР. Разама з тым было прызнана, што народы Расіі, Беларусі і Украіны маюць гістарычную еднасць, і стваралася Садружнасць Незалежных Дзяржаў як новая міжнадзяржаўная супольнасць.

Пасля некаторых разважанняў да «белавежскай тройкі» далучыліся кіраўнікі яшчэ 8 саюзных рэспублік (Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Таджыкістана, Туркменістана і Узбекістана). 21 снежня 1991 г. усе разам яны падпісалі ў г. Алматы дэкларацыю і падтрымалі Белавежскае пагадненне. А ўжо 25 снежня таго ж года першы і апошні Прэзідэнт СССР Міхаіл Гарбачоў пайшоў у адстаўку. СССР спыніў сваё існаванне.

Прычыны распаду Савецкага Саюза з'яўляюцца прадметам актыўных даследаванняў і навуковай дыскусіі. Па адных меркаваннях, савецкі лад з самага пачатку быў павінен разваліцца і ўвогуле быў нежыццяздольным. Па другіх – СССР развалі ўся выключна пад знешнім уздзеяннем ЗША і іх саюзнікаў, а таксама ў выніку мэтанакіраванай працы празаходніх дзеячаў унутры краіны.

Калі ўзважыць усе вядомыя зараз абставіны, то можна вылучыць некалькі блокаў прычын развалу Савецкага Саюза, якія узаемазвязаны паміж сабой.

Галоўнымі прычынамі былі найперш эканамічныя. Планавая адміністратыўна-камандная эканоміка вяла да празмернага цэнтралізму ў кіраванні ўсёй народнай гаспадаркай. На месцах прыходзілася ўзгадняць з цэнтрам нават самыя дробныя пытанні. Вертыкальнае размеркаванне, а таксама празмерная мілітарызацыя эканомікі выклікалі ўзнікненне хранічнага дэфіцыту тавараў шырокага ўжытку, што раздражняла людзей, выклікала незадаволенасць усім ладам жыцця.

Час ад часу прадпрымаліся спробы рэформ, аднак яны сутыкаліся з немагчымасцю пераадолець ідэалагічныя догмы. Аднапартыйная сістэма, пры якой уся ўлада належала КПСС, вяла да палітычнай стагнацыі, якая ў літаратуры атрымала назву «застой». Калі кіраўнікі партыі здолелі пайсці на кампраміс, то аказалася, што час для такіх кампрамісаў ужо прайшоў.

Таксама вельмі моцна ўздзейнічала распачатая ў 1946 г. халодная вайна. Супрацьстаянне з Захадам і ўсім капіталістычным светам патрабавала вялікіх намаганняў і сродкаў. Савецкі Саюз аказаўся няздольным вытрымліваць такую напружаную барацьбу працяглы час. Трэба адзначыць, што заходнія, найперш амерыканскія, лідары гэта добра разумелі і пастаянна ўцягвалі СССР у гонку ўзбраенняў, што самым негатыўным чынам сказвалася на стане спраў унутры краіны.

**Палітычны і гаспадарчы крызіс першых гадоў незалежнасці.**

Як бачна з вынікаў рэферэндуму сакавіка 1991 г., для большасці беларусаў развал адзінай краіны стаў нечаканасцю і ўспрымаўся вельмі балюча. У грамадстве панавала разгубленасць. Рэспубліканскія кіраўнікі спачатку не маглі прызвычаіцца да прыняцця самастойных рашэнняў без позірку ў бок саюзнага цэнтра. Да таго ж была разбурана агульная сістэма кіравання гаспадаркай і размеркавання тавараў.

Усе гэтыя абставіны абвастраліся адсутнасцю неабходнай заканадаўчай базы, бо працягвалі дзейнічаць савецкія прававыя нормы. Неабходна было фактычна занава ствараць новую юрыдычную базу дзяржаўнага і эканамічнага будаўніцтва. Аднак гэты працэс ішоў вельмі марудна з-за вострай палітычнай барацьбы ў рэспубліцы.

Паводле ацэнкі экспертаў Сусветнага банка на момант атрымання незалежнасці ў 1991 г. Беларусь лідзіравала сярод рэспублік СНД па паказчыках прыбытку на душу насельніцтва. Рэспубліка мела развіты прамысловы сектар, які з улікам яго долі ва ўнутраным валавым прадукце рабіў яе адной з самых індустрыялізаваных краін свету. Таму крызіс у беларускай эканоміцы пачаўся пазней, чым у іншых рэспубліках СССР. Толькі ў 1991 г. упершыню адбылося абсалютнае падзенне вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. Крызіс працягваў паглыбляцца і набыў абвальны характар. Адбыўся спад вытворчасці. З 1991 г. пачаўся нястрымны рост інфляцыі з-за павышэння і частковай лібералізацыі цэн на прадукцыю і ўвядзення новых тарыфаў на транспартныя паслугі. Тэмп інфляцыі ў Беларусі ў 1993--1994 гг. перавышае 2000%. У выніку высокай інфляцыі абясцэньваліся асноўны і абаротны капітал прадпрыемстваў і грашовыя зберажэнні грамадзян. Ва ўмовах інфляцыі пагоршыліся фінансавыя паказчыкі галін і прадпрыемстваў. У гэты крызісны перыяд адбываўся пераліў капіталу з вытворчай дзейнасці ў гандлёва-пасрэдніцкую.

Дэзінтэграцыйныя працэсы на тэрыторыі былога СССР асабліва негатыўна адбіліся на Рэспубліцы Беларусь, паколькі яе эканоміка з’яўлялася «зборачным цэхам» і была ў найбольшай ступені інтэгравана з астатнімі часткамі народнагаспадарчага комплексу Савецкага Саюза. Страта эканамічных сувязей, рэзкі рост цэн на энерганосьбіты, імпартуемыя сыравіну і матэрыялы, а таксама глыбокія трансфармацыйныя працэсы ў сістэме сацыяльна-эканамічных інстытутаў сталі прычынамі глыбокіх узрушэнняў, якія перажыла Беларусь у 1-й палове 1990-х гг.

Крызіс стаў сістэмным. Ён ахапіў прамысловую і сельскагаспадарчую вытворчасць, фінансы, сацыяльную сферу. Найбольшы ўплыў на зацяжны характар крызісу аказалі: высокая інфляцыя, якая прывяла да абясцэньвання нацыянальнай грашовай адзінкі; рост дэфіцыту гандлёвага балансу; цяжкае фінансавае становішча дзяржавы, прадпрыемстваў і насельніцтва; скарачэнне аб’ёмаў інвестыцый у эканоміку, якое абмяжоўвала да мяжы магчымага абнаўленне вытворчага патэнцыялу, тэхнічнага і тэхналагічнага яго пераўзбраення ва ўмовах вельмі слабага прытоку замежных інвестыцый; недастатковасць стымулаў для развіцця прадпрымальніцтва.

Адбылося разбурэнне планавых метадаў вядзення гаспадаркі пры адсутнасці дзеючых эфектыўных рынкавых механізмаў, былі моцна аслаблены рычагі кіравання дзяржаўным сектарам эканомікі, што спрыяла нарастанню сацыяльна-эканамічнага крызісу ў рэспубліцы ў цэлым, падзенню ўзроўню жыцця і ўзмацненню дыферэнцыяцыі даходаў насельніцтва.

Распрацаваныя і прынятыя да выканання рынкавыя па сваёй сутнасці праграмы аказалі істотны ўплыў на далейшае дзяржаўнае будаўніцтва,

дазволілі набыць вопыт стварэння рынкавай эканомікі, забяспечылі паступовыя змены ў менталітэце насельніцтва (пераход ад уяўленняў абавязковасці ўраўняльнага размеркавання выгод і ўтрыманства да разумення неабходнасці рынкавай гаспадаркі, якая забяспечвае больш высокія даходы за высокапрадукцыйную працу).

Рэальныя даходы насельніцтва ў выніку інфляцыі знізіліся амаль у 2 разы. На працягу 1991--1994 гг. цэны вытворцаў прамысловай прадукцыі ўзраслі ў 9 тыс. разоў, спажывецкія цэны на тавары і платныя паслугі -- у 3,2 тыс. разоў. Грашовыя даходы насельніцтва рэспублікі павысіліся толькі ў 2,3 раза.

Разам з тым у Беларусі, у адрозненне ад суседніх краін СНД і дзяржаў Балтыі, лібералізацыя цэн спалучалася з захаваннем значнай колькасці рэгулюемых цэн на харчовыя і многія прамысловыя тавары. У выніку узмацніўся вываз тавараў з фіксаванымі і рэгуляванымі цэнамі ў суседнія краіны, што спрыяла павелічэнню дэфіцыту на спажывецкім рынку рэспублікі. Не выратавала становішча ўвядзенне так званых талонаў і купонаў, картак спажыўца, а таксама прыняцце закона «Аб абароне ўнутранага спажывецкага рынку», рэалізацыя якога з дапамогай адміністрацыйных мер адмоўна адбілася на развіцці рынкавых рэформ.

У 1990-я гг. для ацэнкі пакупальніцкай здольнасці стаў выкарыстоўвацца так званы мінімальны спажывецкі бюджэт (МСБ), які ўяўляе сабой грашовыя выдаткі на набыццё тавараў і паслуг для задавальнення асноўных фізіялагічных і сацыяльна-культурных патрэбнасцей чалавека.

Эканамічны крызіс цяжка адбіўся на многіх паказчыках ўзроўню жыцця. З’явілася беспрацоўе, якога жыхары рэспублікі не ведалі ўжо шмат дзесяцігоддзяў. Колькасць толькі зарэгістраваных беспрацоўных павялічылася з 2,3 тыс. чалавек ў 1991 г. да 101,2 тыс. 1994 г., што складала 2,1% эканамічна актыўнага насельніцтва.

У цэлым на працягу кароткага часу адбылося значнае скарачэнне выдаткаў дзяржавы на сацыяльнае забеспячэнне. Сталі рэзка зніжацца аб’ёмы будаўніцтва жылля і аб’ектаў сацыяльна-культурнага прызначэння. Разам з тым у 1991--1994 гг. захоўваліся станоўчыя тэндэнцыі ў галіне медыцынскага абслугоўвання. Павялічылася колькасць урачоў усіх спецыяльнасцей, колькасць урачэбных устаноў, якія аказваюць амбулаторна-паліклінічную дапамогу. Аднак гэтыя і іншыя пазітыўныя змены былі малалікія і не маглі істотна паўплываць на падзенне матэрыяльнага дабрабыту народа. У цэлым за 1991--1993 гг. узровень жыцця ў Беларусі знізіўся на 34%.

Наглядным паказчыкам глыбіні эканамічнага крызісу і яго негатыўнага ўздзеяння на жыццёвы ўзровень беларускага народа было зніжэнне сярэдняй працягласці жыцця ў 1991--1994 гг. з 71,1 да 68,9 года, у тым ліку ў жанчын -- з 75,6 да 74,3 года, у мужчын - з 66,3 да 63,5 года. Хуткімі тэмпамі стала расці смяротнасць насельніцтва Беларусі. Пачынаючы з 1993 г. у Беларусі ўпершыню за апошнія 50 гадоў пачала назірацца тэндэнцыя скарачэння колькасці насельніцтва, якая ў 1993 г. скарацілася на 11,2 тыс., у 1994 г. -- на 19,4 тыс. чалавек.

Нягледзячы на ўсе эканамічныя цяжкасці, кіраўніцтва Беларусі не пагадзілася на правядзенне рэформ па так званым метадзе «шокавай тэрапіі», які прадугледжваў рэзкі пераклад сацыяльнай сферы на рынкавыя ўзаемаадносіны. Урад Рэспублікі Беларусь захаваў адказнасць за мінімальны ўзровень сацыяльных гарантый у такіх сферах як ахова здароўя, адукацыя, культура, жыллёва-камунальная гаспадарка. Сацыяльная абарона насельніцтва забяспечвалася пасродкам перагляду мінімальнай заработнай платы. Дзяржава таксама захавала кантроль за рознічнымі цэнамі і тарыфамі на асноўныя спажывецкія тавары і паслугі, у тым ліку на паліва, газ і электраэнергію для насельніцтва.

Фактычна на той час Беларусь з’яўлялася парламенцкай рэспублікай. Выканаўчая ўлада належала Кабінету міністраў, які ўзначальваў В. Кебіч, а заканадаўчая – Вярхоўнаму Савету 12-га склікання. Функцыі кіраўніка дзяржавы выконваў Старшыня Вярхоўнага Савета. На той час гэту пасаду займаў С. Шушкевіч. У першай палове 1990-х гг. хутка расла колькасць палітычных партый. У сярэдзіне 1993 г. іх налічвалася 12, а таксама 7 грамадска-палітычных аб’яднанняў. Актыўна ствараліся і новыя няўрадавыя грамадскія аб’яднанні. У 1994 г. іх было ўжо 784. Фармальна яны не ставілі сваёй мэтай барацьбу за ўладу, але ва ўмовах палітычнай нестабільнасці часта бралі на сябе функцыі палітычных партый.

Абстаноўку палітычнага крызісу і нават пэўнай хаатычнасці палітычнага жыцця падкрэслівае той факт, што на працягу чатырох гадоў Вярхоўны Савет не мог прыняць Канстытуцыю краіны. У Рэспубліцы Беларусь працягвала дзейнічаць савецкая Канстытуцыя 1978 г. з тымі дапаўненнямі, якія былі ўнесены найперш Дэкларацыяй аб дзяржаўным суверэнітэце і іншымі прававымі актамі перыяду фарміравання незалежнай дзяржавы.

На працягу 1991--1994 гг. Вярхоўны Савет валодаў фактычна абсалютнай уладай у краіне. Ён мог прымаць любыя рашэнні, аднак сама працэдура іх абмеркавання і галасавання вельмі зацягвалася, што самым негатыўным чынам паўплывала на эканамічную сітуацыю, настроі грамадства.

Асноўныя спрэчкі разгарнуліся вакол пытання, якой быць рэспубліцы: прэзідэнцкай альбо парламенцкай. Апазіцыя Беларускі нардны фронт (БНФ) выступала супраць увядзення пасады прэзідэнта з шырокімі паўнамоцтвамі, які б выбіраўся ўсімі грамадзянамі. У той жа час большасць парламента не магла кансалідавацца, бо не мела сталага і харызматычнага лідара. Аднак пастунова значная частка выканаўчай улады і дэпутатаў стала аб’ядноўвацца вакол фігуры В. Кебіча. Урад атрымаў дадатковыя паўнамоцтвы ў галіне кіравання, а ў парламенце была створана праўрадавая група дэпутатаў «Беларусь». У выніку адкрытага супрацьстаяння розных палітычных груповак узнік палітычны крызіс канца 1993 г. Насельніцтва ўсё мацней выказвала незадаволенасць станам рэчаў у гаспадарцы, галечай, татальнай карумпіраванасцю. На фоне такіх настрояў вялікі грамадскі рэзананс меў даклад, зроблены ў кастрычніку 1993 г. на пасяджнні Вярхоўнага Савета дэпутатам А. Лукашэнкам, які ўзначальваў часовую камісію па барацьбе з карупцыяй. У рэшце рэшт, С. Шушкевіч быў адхілены 26 студзеня 1994 г.

большасцю галасоў з пасады старшыні парламента, а Вярхоўны Савет узначаліў М. Грыб. Прэм'ер-міністр В. Кебіч здолеў захаваць уладу.

**Прыняцце Канстытуцыі і першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Трансфармацыя грамадска-палітычнай сістэмы, з'яўленне ў ёй новых элементаў, глыбокі эканамічны крызіс -- усе гэтыя фактары ставілі перад урадам рэспублікі складаныя задачы і патрабавалі ад яго прымянення новых метадаў кіравання. Беларуская палітычная сістэма мела патрэбу ў моцным цэнтры, які мог бы ўзяць на сябе адказнасць за лёс дзяржавы.

15 сакавіка 1994 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў новую Канстытуцыю -- Асноўны Закон краіны. Беларусь абвяшчалася ўнітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай. Канстытуцыя таксама ўводзіла ў краіне прэзідэнцкую форму праўлення, што істотна змяняла характар і структуру выканаўчай улады. Праводзячы канстытуцыйную рэформу, беларуская палітычная эліта ў значнай ступені дзейнічала па прыкладу краін Захаду, дзе інстытут прэзідэнства існаваў на працягу некалькіх стагоддзяў і даказаў уласную эфектыўнасць у якасці аднаго са складнікаў элементаў дэмакратычнай палітычнай сістэмы. Ўвядзенне пасады прэзідэнта ў Беларусі таксама падкрэслівала незалежны і суверэнны статус новаўтворанай дзяржавы, што ў першыя гады самастойнага існавання нават па псіхалагічных матывах было вельмі важна як для палітычнай эліты, так і для ўсяго беларускага грамадства.

У выніку другога тура выбараў 10 ліпеня 1994 г. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь быў абраны А.Р. Лукашэнка. Прыход ва ўладу маладога палітыка новай фармацыі прывёў да істотнага абнаўлення беларускай палітычнай эліты. З гэтага моманту ў найноўшай гісторыі Беларусі пачаўся этап прэзідэнцкага кіраўніцтва.

Першая палова 1990-х гг. -- найбольш складаны перыяд у гісторыі незалежнай Рэспублікі Беларусь. Эканамічны крызіс аказаў значны негатыўны ўплыў на сацыяльную сферу. Дэстабілізацыя эканомікі і дэзарганізацыя сацыяльнай сферы выклікалі ў грамадстве пачуццё нявызначанасці, няўпэўненасці ў заўтрашнім дні і разам з тым істотна павысілі палітычную актыўнасць насельніцтва. Гэта быў час назапашвання палітычнага вопыту, школа палітычнай культуры, першы нялёгкі этап у будаўніцтве ўласнай дэмакратычнай дзяржавы.

У Рэспубліцы Беларусь інстытут прэзідэнцтва быў уведзены адначасова з прыняццем Канстытуцыі 1994 г. Вопыт дзяржаў, якія перажылі аднапартыйную сістэму, блізкіх па тэрыторыі і колькасці насельніцтва да Беларусі, паказвае, што выхад з эканамічнага крызісу найбольш аптымальна забяспечваецца праз моцную прэзідэнцкую ўладу, перавагай якой з'яўляецца хуткае рэагаванне, прыманне і рэалізацыя найбольш рацыянальных рашэнняў. На моцную асобу арыентаваны і менталітэт беларускага народа. Раней першымі асобамі ў дзяржаве былі Першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Беларусі, Старшыня Вярхоўнага Савета, цяпер ім стаў Прэзідэнт. Увядзенне

інстытута прэзідэнцтва ў Беларусі адкрыла новы этап у развіцці беларускай дзяржаўнасці, сведчыла пра ўспрыманне дзяржаўна-палітычных інстытутаў дэмакратычных краін.

Пры выбары мадэлі прэзідэнцтва ў Беларусі вырашальнае значэнне мела тая акалічнасць, што пост прэзідэнта засноўваўся ўпершыню ў гісторыі Беларусі. Таму палітыка-прававы статус інстытута прэзідэнцтва не быў выразна функцыянальна прапрацаваны і зафіксаваны заканадаўчымі актамі. Канстытуцыяй не ўсталёўваўся дзейсны прававы механізм узаемадзеяння прэзідэнта з іншымі ўладнымі структурамі. Прэзідэнт краіны звярнуўся да народа як вышэйшай крыніцы дзяржаўнай улады, выступіўшы ініцыятарам правядзення рэспубліканскага рэферэндуму па пытаннях унясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. На лістападаўскі рэферэндум 1996 г. былі прадстаўлены прэзідэнтам і парламентам (фракцыямі аграрыяў і камуністаў) 2 праекта новай рэдакцыі Канстытуцыі. У першым варыянце прадугледжвалася рэфармаванне ўсёй сістэмы дзяржаўнай улады з вядучым становішчам прэзідэнта, у другім -- скасаванне пасады прэзідэнта і функцыянаванне дзяржаўнага механізму ва ўмовах вяршэнства заканадаўчага органа.

Інстытут прэзідэнцтва з’яўляецца вядучым органам дзяржаўнай улады, а Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка -- не толькі юрыдычна, але і фактычна -- лідэр беларускай дзяржавы, які карыстаецца вялікай падтрымкай насельніцтва краіны. Пацвярджэннем гэтаму з’яўляецца актыўнасць беларускіх выбаршчыкаў на прэзідэнцкіх выбарах: у 2001 г. у галасаванні прынялі ўдзел 83,86% грамадзян ад колькасці ўключаных у спісы, у 2006 г. -- 92,6%, у 2010 г. -- 90,65%. Дзеючы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка ўстойліва лідзіруе: у 2001 г. за яго прагаласавалі 75,76%, у 2006 г.-- 83%, у 2010 г. -- 79,65% ад тых, хто прыняў удзел у галасаванні.

**Рэферэндумы 1995, 1996, 2004, 2022 гг. і іх уплыў на стабілізацыю абстаноўкі ў краіне.**

Выкарыстанне ў Беларусі такіх вышэйшых форм волевыяўлення народа, як Усебеларускія народныя сходы і рэферэндумы яскрава сведчыць пра дэмакратычную накіраванасць дзяржавы.

Канстытуцыя Беларусі, валодаючы прыярытэтам перад любым законам і міжнароднай дамовай, прадастаўляе народу як адзінай крыніцы дзяржаўнай улады ў краіне магчымасць скарыстацца сваім правам на правядзенне рэферэндуму (народнага галасавання).

У Беларусі адбыліся чатыры рэспубліканскіх рэферэндумы (для параўнання: усяго ў свеце іх прайшло больш за 900).

**14 мая 1995 г**. калі адбыўся першы рэспубліканскі рэферэндум у незалежнай Рэспубліцы Беларусь па пытаннях, якія мелі вялікае значэнне для далейшага развіцця маладой суверэннай дзяржавы -- Рэспублікі Беларусь: аб статусе рускай мовы, аб усталяванні новых Дзяржаўнага

сцяга і Дзяржаўнага герба, аб эканамічнай інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй, аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Вынікі галасавання па кожным пытанні, вынесеным Прэзідэнтам краіны на рэспубліканскі рэферэндум 14 мая 1995 г., былі наступнымі:

- 83,3% беларускіх грамадзян прагаласавалі за наданне рускай мове роўнага статусу з беларускай; супраць выказаліся 12,7%. Прынятае беларускімі грамадзянамі рашэнне аб наданні рускай мове роўнага статусу з беларускай з'явілася адным з фактараў стабілізацыі беларускага грамадства.

Пытанне аб дзяржаўным статусе не толькі беларускай, але і рускай мовы было вырашана ў новай рэдакцыі Закона «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» ад 13 ліпеня 1998 г. Згодна з Законам дзяржава павінна забяспечваць усебаковае развіццё і функцыянаванне двух моў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

Важнай гарантыяй правоў беларускіх грамадзян на карыстанне дзвюма дзяржаўнымі мовамі з'яўляецца ўстанаўленне адказнасці службовых асоб за адмову прыняць і разгледзець зварот грамадзяніна на беларускай, рускай мовах са спасылкай на няведанне мовы звароту.

У цяперашні час у беларускім грамадстве пытанне раўнапраўя дзвюх дзяржаўных моў вырашана. Так, сацыялагічнае даследаванне, праведзенае ў 1- м квартале 2007 г., паказала раўнапраўе беларускай і рускай моў. Напрыклад, не назіраецца прамой сувязі паміж мовай, якая выкарыстоўваецца беларускімі грамадзянамі ў паўсядзённым жыцці, і мовай, якую яны лічаць роднай. Сярод тых, хто назваў у якасці асноўнай мовы сваіх зносін рускую, 30,1% адзначылі, што беларуская мова ім бліжэй і радней. У сваю чаргу 41,3% беларускамоўных апытаных адзначылі рускую мову як родную. Сярод тых, хто размаўляе на змяшанай беларуска-рускай мове, 59,1% лічаць роднай рускую, 49,0% -- беларускую мову.

- 75,1% грамадзян з лікутых, якія прынялі ўдзел у галасаванні, выказаліся за прапанову аб устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

Па выніках рэферэндуму Прэзідэнт краіны А.Р. Лукашэнка 7 чэрвеня 1995 г. падпісаў два ўказы: «Аб зацвярджэнні эталона Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Палажэння аб Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні Палажэння аб Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь». Так наша краіна набыла дзейсныя цяпер Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг.

- Станоўчае рашэнне на рэферэндуме пытання аб эканамічнай інтэграцыі з Расіяй (83,3% -- «за») узмацніла гэты працэс, пацвердзіўшы правільнасць дзеянняў па развіцці інтэграцыйных працэсаў.

2 красавіка 1997 г. у Маскве быў заключаны Дагавор аб Саюзе Беларусі і Расіі, а таксама падпісаны Статут Саюза Беларусі і Расіі. У адпаведнасці з Дагаворам дзве дзяржавы вырашылі на добраахвотнай аснове ўтварыць глыбока інтэграваную палітычна і эканамічна

Супольнасць Беларусі і Расіі ў мэтах аб’яднання матэрыяльнага і інтэлектуальнага патэнцыялаў сваіх дзяржаў для пад’ёму эканомікі, стварэння роўных умоў павышэння ўзроўню жыцця народаў і духоўнага развіцця асобы.

Курс беларуска-расійскіх адносін на цесную інтэграцыю застаецца нязменным, паколькі яго аснову складаюць аб’ектыўная ўзаемазалежнасць і ўзаемадапаўняльнасць эканомік, цесныя эканамічныя і культурныя сувязі і, што асабліва важна, шчырае імкненне народаў да яднання.

• Пытанне аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета 13-га склікання Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь падтрымалі 77,7% грамадзян, супраць выказаліся 17,8%.

Другі рэспубліканскі рэферэндум адбыўся **24 лістапада 1996 г.** Патрэба ў правядзенні народнага галасавання 24 лістапада 1996 г. была абумоўлена неабходнасцю ўдакладнення шэрагу канстытуцыйных палажэнняў.

Паводле афіцыйных дадзеных, апублікаваных Цэнтральнай камісіяй Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, вынікі народнага галасавання 24 лістапада 1996 г. па кожнаму з пытанняў выглядаюць наступным чынам:

• большасць грамадзян (88,18%) з ліку тых, якія прынялі ўдзел у галасаванні, падтрымалі прапанову Прэзідэнта краіны А.Р. Лукашэнка аб пераносе святкавання Дня Незалежнасці на 3 ліпеня і толькі 10,45% выказаліся супраць. І гэта свята стала сапраўды ўсенародным.

• 70,45% беларусаў ад агульнай колькасці выбаршчыкаў прагаласавалі за праект Канстытуцыі, прапанаваны Кіраўніком дзяржавы, і толькі 7,93% -- за праект, прапанаваны дэпутацкімі фракцыямі камуністаў і аграрыяў. Супраць прагаласавалі адпаведна 9,39 і 71,2%.

• 82,88% грамадзян, якія ўдзельнічалі ў галасаванні, выказаліся супраць свабоднай (без абмежаванняў) куплі і продажу зямлі. За прагаласавалі 15,3%.

• 80,44% грамадзян не падтрымалі адмену ў Беларусі смяротнай казні. Час паказвае, што грамадства яшчэ не гатова да гэтага.

Асноўным вынікам рэферэндуму і важнай вяхой у далейшым развіцці суверэннай беларускай дзяржавы з’явілася ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнцкі варыянт рэдакцыі Асноўнага Закона стварыў цалкам новую мадэль дзяржаўнага ладу Беларусі.

Не менш важнае значэнне для нашай краіны меў трэці рэспубліканскі рэферэндум, які адбыўся **17 кастрычніка 2004 г.**, на якім народ, па сутнасці, даў ацэнку дзейнасці Кіраўніка дзяржавы за дзесяцігадовы перыяд. Прэзідэнт фактычна трымаў экзамен перад грамадзянамі сваёй краіны.

Рэферэндум 17 кастрычніка 2004 г. быў звязаны з канстытуцыйным абмежаваннем Прэзідэнту выбірацца на вышэйшую пасаду ў дзяржаве больш за вызначаныя тэрміны. У свеце вядомы розныя спосабы

вырашэння такой праблемы. Аднак А.Р. Лукашэнка вырашыў напрамую звярнуцца да грамадзян. На агульнанароднае галасаванне выносілася наступнае пытанне:
*«Ці дазваляеце Вы першаму Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Лукашэнка А.Р. удзельнічаць у якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у выбарах Прэзідэнта і ці прымаеце частку першую артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь на аснове усеагульнага, свабоднага, раўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні?»*

Усяго ў рэферэндуме прыняла ўдзел 79,42% выбаршчыкаў. Ініцыятыву Прэзідэнта падтрымалі 90,1% тых, хто прыйшоў на выбарчыя ўчасткі.

Насельніцтва Рэспублікі Беларусь прагаласавала за прыняцце часткі першай артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у наступнай рэдакцыі: «Прэзідэнт абіраецца на пяць гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры таемным галасаванні».

**27 лютага 2022 г.** абыўся чацвёрты рэспубліканскі рэферэндум, на якім было вынесена адзінае пытанне: "Ці прымаеце Вы змены і дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?". Рэферэндум быў адумоўлены неабходнасцю далейшага развіцця беларускай дзяржаўнасці і праведзены ў адпаведнасці з рашэннем VI Усебеларускага народнага сходу. У новай рэдакцыі Канстытуцыі адлюстраваны пытанні пераразмеркавання ўладных функцый Прэзідэнта і дэлегавання ўлады заканадаўчым і выканаўчым галінам. Па новай рэдакцыі Канстытуцыі нададзеныя новыя паўнамоцтвы нацыянальнаму інстытуту народаўладдзя – Усебеларускаму народаму сходу. Падтрымалі новую рэдакцыю Канстытуцыі 82,86 % грамадзям з ліку тых, хто прыняў удзел у народным галасаванні.

**Сучасныя дасягненні беларускай дзяржавы.**

Для беларускага грамадства характэрна гістарычная пераемнасць. Развал адзінай краіны -- Савецкага Саюза -- ў 1991 г. быў успрыняты большасцю беларусаў як геапалітычная катастрофа. Аднак дыялектыка гістарычнага працэсу паставіла на парадак дня пытанне аб пабудове новай незалежнай дзяржавы. Пры гэтым у Беларусі з павагай ставяцца да гісторыі. Беражлівыя адносіны да памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, да ветэранаў вайны, сталі неад'емнай часткай ідэалогіі беларускай дзяржавы. Праз паважлівае стаўленне да мінулага, праз цесную пераемнасць пакаленняў у грамадзян выхоўваецца адказнасць за сённяшні дзень і будучыню сваёй краіны.

Найважнейшым інстытутам беларускай дзяржавы з'ўляецца прэзідэнцтва. Менавіта Кіраўнік дзяржавы выступае як гарант выканання Канстытуцыі, правоў і свабод грамадзян. Асноўны закон надае яму ролю арбітра паміж галінамі ўлады, ключавога звяна ў сістэме забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Прэзідэнт таксама выбудоўвае вертыкаль улады ад рэспубліканскага да мясцовага ўзроўню.

Найважнейшымі функцыямі Нацыянальнага сходу з'яўляюцца

**заканадаўчая** (фарміраванне прававой базы краіны) і прадстаўнічая, галоўная мэта якой -- адлюстраванне інтарэсаў сваіх выбаршчыкаў у дзейнасці органаў улады. Беларускі парламент складаецца з дзвюх палат -- Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў абіраюцца на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага, прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Савет Рэспублікі з’яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Акрамя разгляду праектаў законаў, парламент прызначае выбары Прэзідэнта, дае згоду Прэзідэнту на прызначэнне Прэм’ер-міністра, Старшыні Канстытуцыйнага Суда, іншых вышэйшых дзяржаўных асоб краіны. Парламент можа прымаць рашэнні па іншых пытаннях, прадугледжаных Канстытуцыяй краіны.

**Выканаўчую ўладу** ў краіне ажыццяўляе Урад -- Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, які з’яўляецца цэнтральным органам дзяржаўнага кіравання. Савет Міністраў распрацоўвае асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі, прымае меры па іх рэалізацыі, забяспечвае правядзенне адзінай эканамічнай, фінансавай і грашова-крэдытнай палітыкі ў краіне. У сваёй дзейнасці Урад падсправаздачны Прэзідэнту краіны і адказны перад парламентам.

**Судовая ўлада** ўяўляе сабой самастойны і незалежны дзяржаўны інстытут.

Такім чынам, у Беларусі прысутнічае класічны падзел на тры галіны ўлады (заканадаўчая, выканаўчая, судовая) пры дэлегаванні значных паўнамоцтваў Прэзідэнту.

У цяперашні час у Беларусі склалася сітуацыя, пры якой грамадскія аб’яднанні (а іх налічваецца больш за 2200). Гэта сведчыць аб наяўнасці прамога кантакта ўлады і грамадства без пасрэднікаў. Найбуйнейшыя грамадскія арганізацыі – Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, «Белая Русь».

Пры актыўным развіцці ўсіх галін дзяржаўнага і грамадскага жыцця стаўка робіцца на падтрымку таленавітых людзей, здольных прынесці славу сваёй краіне. Для гэтага створана цэлая сістэма фондаў і грантаў, конкурсаў і фестываляў. За апошнія гады істотна абноўлена матэрыяльная база культурных устаноў, пабудавана мноства новых аб’ектаў, некаторыя з іх сталі шэдэўрамі сучаснай архітэктуры.

Істотным дасягненнем беларускай мадэлі развіцця з’яўляецца захаванне канфесійнай і міжнацыянальнай згоды. Адной з асноў нацыянальнага адзінства стала ўвядзенне ў 1995 г. раўнапраўя беларускай і рускай моў. Мудрасць гэтага калектыўнага рашэння, прынятага на рэферэндуме, становіцца відавочнай на прыкладзе іншых постсавецкіх краін, дзе моўная праблема стала каменем сутыкненняў і каталізатарам палітычных і ўзброеных сутыкненняў.

Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь абапіраецца на выразна сфармуляваную канцэпцыю каардынацыі намаганняў дзяржавы і грамадства на міжнароднай арэне. У яе аснове ляжыць прынцып

шматвектарнасці. Ён азначае, што краіна гатова да паўнавартаснага і раўнапраўнага развіцця адносін з усімі дзяржавамі планеты без якіх-небудзь папярэдніх умоў і прэтэнзій. Рэспубліка Беларусь традыцыйна выступае за фарміраванне шматпалярнага свету, супраць дыктату з боку якіх-небудзь дзяржаў. Афіцыйны Мінск адхіляе падвойныя стандарты пры вырашэнні міжнародных праблем.

Беларусь ўваходзіць ва ўсе міждзяржаўныя арганізацыі, якія заклiканы садзейнічаць кааперацыі і супрацоўніцтву па розных напрамках: СНД, АДКБ, ЕАЭС і інш.

Пры гэтым вызначаны два стратэгічных партнёра Беларусі на сусветнай арэне -- Расія і Кітай. Адносіны з Расійскай Федэрацыяй абапіраюцца на выніку народнага рэферэндума 1995 г., калі быў адобраны курс на інтэграцыю з брацкай краінай. 2 красавіка 1996 г.было ўтворана Супольнасць Беларусі і Расіі, а 8 снежня 1999 г. падпісаны Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. У выніку саюзнае будаўніцтва, нягледзячы на ўсе складанасці і перыядычна ўзнікаючыя супярэчнасці, ператварылася ў неад’емны атрыбут айчыннай грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай мадэлі.

Яшчэ ў сярэдзіне 1990-х гг. была зроблена стаўка на блізкае партнёрства з КНР. У выніку Беларусь стала ключавым пунктам у «эканамічным поясе Вялікага Шаўковага шляху» -- кітайскай ініцыятыве, заклiканай актывізаваць эканамічныя і транспартныя сувязі на еўразійскай прасторы. Яркім увасабленнем гэтага новага праекта з’яўляецца кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі Камень», які ўзводзіцца пад Мінскам.

Беларусь мае трывалыя пазіцыі і аўтарытэт у краінах Лацінскай Амерыкі, Блізкага Ўсходу, Афрыкі, Паўднёва-Усходняй Азіі. Галоўнай задачай знешнепалітычнай актыўнасці на гэтых напрамках з’яўляецца прасоўванне эканамічных інтарэсаў краіны.

Беларусь -- тэрыторыя міру і стварэння. Рэалізаваўшы сваё права на самавызначэнне, Рэспубліка Беларусь праводзіць самастойную знешнюю палітыку. Геаграфічнае становішча нашай дзяржавы, на тэрыторыі якой сыходзяцца найважнейшыя транспартныя шляхі паміж Еўропай і Азіяй, і няпростая гісторыя краіны, якая выпрабавала на сабе разбуральныя наступствы шматлікіх еўрапейскіх войнаў і канфліктаў, абумовілі курс на шматвектарнасць знешняй палітыкі як фундаментальны прынцып, які прадугледжвае развіццё збалансаваных канструктыўных адносін з партнёрамі ў розных рэгіёнах свету.

Прынцыпы знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь -- прагматычнасць і паслядоўнасць, узаемная павага, раўнапраўе, неўмяшанне ва ўнутраныя справы, адмова ад ціску і прымусу.

Стварыўшы ўласную сацыяльна-эканамічную мадэль, Беларусь тым самым забяспечыла эканамічную бяспеку -- краіна корміць сябе і пастаўляе прадукты іншым, прамысловая прадукцыя, нягледзячы на жорсткую канкурэнцыю, прабіваецца на знешнія рынкі. Беларусь годна

жыве, зарабляючы на жыццё сваёй працай і розумам.

У 2011--2015 гг. у краіне вялося шырокамаштабнае абнаўленне, нацэленае на якасна новае развіццё Беларусі, ажыццяўляліся рэальныя праекты сістэмнага развіцця экспартна арыентаванай эканомікі, нарошчваўся вытворчы патэнцыял. Першарадная ўвага ўдзялялася мадэрнізацыі тых галін, якія выкарыстоўваюць мясцовыя сыравінныя рэсурсы.

Эфектыўная сацыяльна-эканамічная палітыка дзяржавы дазволіла захаваць у Беларусі сацыяльную стабільнасць і паступальнае развіццё краіны. ВУП на душу насельніцтва па парытэце пакупніцкай здольнасці ў параўнанні з 2010 г. вырас да 17,9 тыс. долараў. За пяцігодку рэальная заработная плата павялічылася на 39%, рэальны памер пенсій па ўзросце -- на 37,3%, рэальныя наяўныя грашовыя даходы -- на 33%.

Дастаткова эфектыўнымі сталі меры па вырашэнню жыллёвай праблемы. Забяспечанасць жыллём вырасла з 25 $м^2$ на аднаго чалавека ў 2010 г. да 26,3 $м^2$ у 2015 г.

Павысілася эфектыўнасць эканамічнай палітыкі: забяспечаны пераход на гнуткае курсаўтварэнне і ўвязку павышэння заработнай платы з прадукцыйнасцю працы, радыкальна скарочана эмісійнае крэдытаванне. Палепшыўся бізнес-клімат Беларусі.

На эканамічным развіцці краіны не мог не адбіцца ўплыў сусветнага фінансавага крызісу, што звязана з высокай ступенню інтэграцыі беларускай эканомікі ў сістэму міжнароднага гандлю. Негатыўна адбіліся на развіцці эканомікі санкцыйная «вайна» ЕС і ЗША з Расіяй, узброенае супрацьстаянне ва Украіне. Але рэалізацыя комплексу мер, у тым ліку па стымуляванні экспарту і аптымізацыі ўнутранага попыту, дазволіла стабілізаваць сітуацыю ў знешнім гандлі, фінансавым сектары, збалансаваць тэмпы эканамічнага росту.

У 2011--2015 гг. праведзена мадэрнізацыя базавых галін эканомікі. Гэта дазволіла не толькі абнавіць тэхналогіі, але і істотна скараціць выдаткі на вытворчасць прадукцыі. Паводле ацэнкі спецыялістаў, зніжэнне ўзроўню матэрыялаёмістасці прадукцыі ў арганізацыях прамысловасці за пяцігодку склала каля 9% ў 2015 г. пры заданні пяцігадовай Праграмы сацыяльна- эканамічнага развіцця «мінус» 5--7%.

За пяць папярэдніх гадоў уведзены ў эксплуатацыю і тэхнічна пераабсталяваны 1184 аб’ектаў малочна-таварнага комплексу. Дзякуючы аўтаматызацыі асноўных тэхналагічных працэсаў сельскагаспадарчай вытворчасці прадукцыйнасць працы аграрыяў павялічылася ў 1,4 раза.

У рэспубліцы рэалізуюцца дзяржаўныя праграмы сацыяльнай дапамогі ветэранам, адзінокім пажылым людзям, інвалідам. Прадастаўляецца рознабаковая дапамога сацыяльна неабароненым катэгорыям грамадзян, у тым ліку тым, якія пражываюць у самых аддаленых населеных пунктах. Характэрна, што сацыяльную накіраванасць беларускай эканомікі вымушаны прызнаць і на Захадзе.